# Сацыякультурныя і сацыяльна-педагагічныя перадумовы дыферэнцыяцыі сучаснай школьнай адукацыі

***А.В.Перавозны,*** *кандыдат педагагічных навук,*
*старшы навуковы супрацоўнік Акадэміі паслядыпломнай адукацыі*

*Аналіз школьнай адукацыйнай практыкі, якая склалася да 80-ых гг., праведзены педагогамі, псіхолагамі, філосафамі, паказаў, што яна недастаткова стымулюе творчую актыўнасць і ініцыятыву вучняў, не стварае ўмоў для раскрыцця іх дараванняў, нівеліруе індывідуальныя адрозненні. У гэтай сувязі ўзнікла ідэя гуманізацыі і дэмакратызацыі адукацыі, якія б кранулі змястоўны і працэсуальны бакі навучання, узаемаадносіны вучняў, настаўнікаў, бацькоў, а таксама сферу кіравання.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Для рэалізацыі гэтай ідэі ў шырокай практыцы пачаў прапагандавацца вопыт настаўнікаў-наватараў, ствараліся навучальныя ўстановы новага тыпу, уключаючы аўтарскія школы, у якіх меркавалася весці развіццёвае навучанне, рабіліся спробы індывідуалізаваць навучальны працэс. Гэтаму ж павінны былі спрыяць розныя нетрадыцыйныя формы вучэбных заняткаў, асноўная задача якіх заключалася ў падтрыманні цікавасці вучняў да школы, стымуляванні іх пазнавальнай актыўнасці.

У рэчышчы ідэі дэмакратызацыі і гуманізацыі — з'яўленне ў вучэбных планах школьнага кампанента, які дазволіў праводзіць заняткі, стымулюючыя актыўнасць і самастойнасць школьнікаў. У выніку лібералізацыі кіравання навучальныя ўстановы атрымалі магчымасць устанаўліваць рэжым сваёй работы, які ў найбольшай ступені раскрывае творчы патэнцыял педагогаў і вучняў, наладжваць узаемаадносіны з рознымі дзяржаўнымі і грамадскімі арганізацыямі, у тым ліку замежнымі. Дадзеныя рэформы надаюць адукацыйнаму працэсу асобасна арыентаваны характар, узмацняюць яго творчы пачатак, павышаюць адаптацыю выпускнікоў да рэалій паўсядзённага жыцця.

Трэба адзначыць, што праблема ўдасканалення адукацыйных сістэм актуальная не толькі для нашай краіны, яна носіць агульнацывілізацыйны характар. У развітых дзяржавах Захаду даўно сталі агульнапрынятымі адносіны да адукацыі як да фактару, які істотна ўплывае на якасць жыцця людзей. Таму там пастаянна вядуцца пошукі аптымальных шляхоў рэфармавання адукацыі, накіраваныя на стварэнне ўмоў для раскрыцця здольнасцей вучняў у розных сферах дзейнасці. Педагагічны менталітэт сучаснага Захаду ўсё больш пранізваюць гуманістычныя ўстаноўкі;

гаворка ідзе “не проста аб развіцці інтэлектуальных якасцей, якія дазваляюць арыентавацца ў зменлівым постіндустрыяльным грамадстве, спраўляцца з “нечаканымі” сітуацыямі заўтрашняга дня, а аб укараненні цэнасных арыенціраў, якія нацэльваюць чалавека на паслядоўную і упэўненую рэалізацыю свайго унікальнага “Я”, будуючы адносіны з іншымі людзьмі на прынцыпах, якія сцвярджаюць культуру годнасці” [3, *45*].

Рэфармаванне адукацыі ў нашай краіне ажыццяўляецца ў выключна складаных умовах. З аднаго боку, недастатковае фінансаванне пагражае самому існаванню шэрага адукацыйных устаноў, падрывае матэрыяльна-тэхнічную базу многіх з іх, спрыяе пераходу вялікай колькасці кваліфікаваных працаўнікоў у іншыя сферы дзейнасці, што лічацца сёння больш прэстыжнымі. З другога боку, сацыяльна-культурныя змены, якія адбыліся ў апошні час, вядуць да росту значэння адукацыі ў жыцці сучаснага грамадства. Так, менавіта якасцю атрыманай адукацыі ў многім вызначаецца гатоўнасць нашых школьнікаў і студэнтаў да адэкватнага ўспрымання іншых культур, сістэм каштоўнасцей, уплыў якіх узрастае ў сувязі з адкрыццём межаў, зняццем ідэалагічных забаронаў.

Узмацненне ролі адукацыі ў сучасных умовах адбываецца яшчэ і таму, што інавацыйныя працэсы ў эканоміцы выявілі неабходнасць у такіх спецыялістах, якія раней не рыхтаваліся ў нашых навучальных установах. Акрамя таго, узрасла патрэбнасць у адукацыйных паслугах, звязаных з павышэннем кваліфікацыі, перападрыхтоўкай работнікаў у адпаведнасці з кан’юнктурай, што складваецца на рынку працы. Гэта абставіна актывізуе пошук новых форм прадастаўлення адукацыі, якія ўлічваюць узровень падрыхтоўкі грамадзяніна, атрыманую ім раней спецыялізацыю.

Стымулюемыя патрэбнасцямі грамадскага развіцця інавацыйныя працэсы ў адукацыі распаўсюджваюцца як на яе змест, у якім на першы план выводзяцца ідэі супрацоўніцтва, дыялога, лаяльнасці да супрацьлеглага пункту погляду, павагі да чужой культуры, правоў чалавека, так і на адукацыйную пабудову, у якой узнікаюць новыя навучальныя установы. Іх паяўленне — вынік прадастаўленай дзяржавай магчымасці праяўляць ініцыятыву, шукаць нестандартныя шляхі вырашэння ўзнікаючых праблем. Такія навучальныя установы, сярод якіх ёсць як дзяржаўныя, так і недзяржаўныя, хутка занялі сваё месца на рынку адукацыйных паслуг.

Паколькі любая прыватная ініцыятыва мае на мэце атрыманне прыбытку, пастолькі ў нашым грамадстве легалізуюцца настроі, якія абвяшчаюць прыярытэт матэрыяльных даброт над духоўнымі патрэбамі. Па меры набліжэння да рынкавай эканомікі гэта тэндэнцыя будзе, відаць, узмацняцца, стане адным з вядучых кампанентаў сістэмы каштоўнасцей новага грамадства.

У такіх умовах адукацыйная сістэма павінна спрыяць далучэнню сваіх выхаванцаў да гуманістычных каштоўнасцей, заключаных у духоўнай культуры, развіццю іх прававой свядомасці, пераадоленню тэхнакратычнага мыслення, якое дапускае прымяненне любых сродкаў для дасягнення пастаўленай мэты.

Культываванне гуманістычных каштоўнасцей у грамадстве пераможнага тэхнакратычнага мыслення звязана з велізарнымі цяжкасцямі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

гады гуманітарызацыя школьнай адукацыі якраз і з'яўляецца спробай сфармаваць у падрастаючага пакалення гуманістычную аснову думак і ўчынкаў. Яна ажыццяўляецца ў двух напрамках: пашыраецца блок гуманітарных дысцыплін незалежна ад профілю навучання, а таксама ўключаецца гуманітарны кампанент у змест прыродазнаўча-матэматычных і тэхнічных дысцыплін. Рэалізацыя другога з напрамкаў мае на мэце змяненні ў змесце гэтых прадметаў, узмацненне ў іх маральна-этычнай, сацыяльнай, экалагічнай праблематыкі.

Вялікае значэнне мае далучэнне дзяцей да розных відаў мастацкай творчасці. На думку М.С.Кагана, "у мастацтве адбываецца нешта дзіўнае і на першы погляд цяжка вытлумачальнае — арганічнае зліццё, поўнае супадзенне чатырох асноўных відаў дзейнасці" [2, *120–121*], да якіх ён адносіць пазнавальную, пераўтваральную, цэнасна-арыентацыйную і камунікатыўную. Дадзеная абставіна дазваляе раслічваць на ўсеахопнае ўздзеянне мастацтва на асобу вучня, якое будзе тым больш моцнае, чым мацней развітымі ў яго акажуцца ўяўленне і мастацкае мысленне. А ступень іх развітасці ў многім вызначаецца методыкай выкладання. У гэтай сувязі "разам з пошукам найбольш эфектыўных метадаў ранняга развіцця механізмаў абстрактна-лагічнага мыслення дзяцей неабходна шукаць спосабы захавання ў іх механізмаў мыслення мастацка-вобразнага" [2, *282*]. Як вядома, вучэбныя планы агульнаадукацыйных школ заўсёды прадугледжвалі заняткі па музыцы і спевах, маляванні. Аднак такія ўрокі не забяспечвалі належнага ўзроўню мастацкага развіцця вучняў, бо ніколі не лічыліся асноўнымі, і, значыць, на іх вывучэнне адводзілася мала часу. На неабходнасць змянення такога становішча ўказвалася неаднаразова, у тым ліку вядомымі музыкантамі, мастакамі.

Зразумела, аднак, што устаноўка на мэтанакіраванае далучэнне вучняў да высокіх ідэй, якія ўтрымліваюцца ў лепшых узорах сусветнай культуры, не можа гарантаваць таго, што яны будуць успрыняты адэкватна і стануць арыенцірам у паўсядзённым жыцці заўтрашніх выпускнікоў школ. Адбіваюцца ўплывы на школьнікаў з боку сяброў, бацькоў, якія могуць мець супрацьлеглы зарад. Немалаважнае значэнне для грамадзянскага станаўлення дзіцяці маюць маральны клімат, сістэма каштоўнасцей, існуючых у грамадстве. Значную ролю адыгрываюць і іншыя фактары, многія з якіх няпроста выявіць без дэталёвага вывучэння ўмоў жыцця растучага чалавека. Ясна адно: найбольшы эфект у маральным развіцці школьніка будзе дасягнуты ў тым выпадку, калі ўсе ўплывы, якія ён адчувае, будуць мець аднанакіраваны характар, які забяспечвае фармаванне сацыяльна ўхваленых якасцей асобы. Верагоднасць дасягнення такога эфекту павысіцца ў стабільным, квітнеючым грамадстве, на стварэнне якога арыентаваны рэформы апошніх гадоў.

Паспяховае правядзенне рэформаў магчыма пры наяўнасці вялікай колькасці адукаваных, самастойна і творча думаючых людзей, якія ствараюць станоўчы зарад вакол пераўтварэнняў. Гэта актуалізуе праблему якасці прадастаўляемых адукацыйных паслуг, іх адпаведнасці перспектыўным напрамкам развіцця грамадства і надае ёй палітычнае, эканамічнае гучанне.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

У Беларусі адукацыйная сістэма ўключае ў сябе такія ступені: дашкольнае навучанне і выхаванне; агульная адукацыя — пачатковая, базавая, сярэдняя; прафесійная — пачатковая, базавая, сярэдняя, вышэйшая, аспірантура, дактарантура. Кожная з іх выконвае функцыі, адпаведныя ўзроставым магчымасцям навучэнцаў. Разам з тым грамадства гарантуе атрыманне кожным грамадзянінам базавай адукацыі, якая ўяўляе мінімум звестак, неабходных для нармальнага жыцця ў грамадстве. Вырашаючы, які напрамак выбраць, кожны індывід улічвае свае здольнасці, жыццёвыя планы. Падобны падыход з'яўляецца сведчаннем разумення грамадствам таго факта, што "даць якасную адукацыю ўсім магчыма толькі ў тым выпадку, калі яна будзе адпавядаць запытам і магчымасцям канкрэтнай асобы" [5, *128*]. Грамадства, ствараючы такія ўмовы, мае права разлічваць на атрыманне спецыяліста, чый патэнцыял акажацца дастатковым для паўнацэннага ўдзелу ў грамадскай вытворчасці ў адпаведнасці з атрыманай кваліфікацыяй. Патрабаванні, прад'яўляемыя да выпускнікоў навучальных устаноў, вызначаюцца існуючай у краіне кан'юнктурай на рынку працы. Ва ўмовах рынкавай эканомікі вельмі важна, каб у іх была сфармавана патрэбнасць у папаўненні сваіх ведаў, набыцці новых, а таксама меўся падмурак, на якім ажыццяўлялася б нарошчванне ведаў. Стварыць усё гэта можа добра наладжаная адукацыйная сістэма, адпавядаючая новым эканамічным задачам.

У апошнія гады быў створаны істотны задзел для разгортвання інавацыйных працэсаў у сённяшняй адукацыі. Нягледзячы на астаткавы прынцып фінансавання, некаторыя школы здолелі стварыць нядрэнную матэрыяльна-тэхнічную базу, супрацоўнічаючы з багатымі шэфамі — буйнымі прамысловымі прадпрыемствамі; у многіх навучальных установах склаўся касцяк высокакваліфікаваных настаўнікаў-энтузіястаў; у псіхолага-педагагічнай навуцы былі праведзены даследаванні, якія раскрывалі магчымасці актывізацыі вучобы школьнікаў, ператварэння іх з аб'ектаў знешніх педагагічных уздзеянняў у суб'екты адукацыйнага працэсу.

Істотны ўплыў на развіццё педагагічнай думкі аказала распрацоўка пытанняў праблемнага навучання, стымулявання пазнавальнай самастойнасці школьнікаў, тэорый змястоўнага абагульнення, аптымізацыі навучальна-выхаваўчага працэсу. На жаль, нашы навучальныя ўстановы працавалі без навукова абгрунтаванага стандарта адукацыі, не быў устаноўлены базавы, абавязковы для ўсіх, узровень падрыхтоўкі па прадмеце, уключаным у вучэбны план. У выніку намаганні многіх вучняў траціліся на вывучэнне дысцыплін, якія іх не цікавілі, і ў той жа час не было магчымасці ўдзяліць належную ўвагу тым з іх, з якімі яны звязвалі сваю прафесійную будучыню.

У сучасных умовах праблема ўпарадкавання зместу адукацыі яшчэ больш актуалізавалася. Гэта звязана з паяўленнем у адукацыйнай сістэме краіны новых, не існаваўшых у савецкі перыяд навучальных устаноў, і суаднясенне іх зместу са зместам традыцыйных устаноў. Цяпер, калі рэспублікі былога Саюза сталі самастойнымі суб'ектамі, увайшлі ў міжнародныя арганізацыі, узнікла неабходнасць у прывядзенні іх адукацыйных стратэгій у адпаведнасць з існуючымі ў перадавых краінах. Такая неабходнасць з'яўляецца вынікам

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

інтэграцыйных працэсаў, якія праходзяць у сучасным свеце і ўключаюць усе грамадскія інстытуты, у тым ліку і адукацыю. І справа заключаецца ў тым, каб не толькі вырашыць пытанні арганізацыйнага характару, але і забяспечыць мадэрнізацыю зместу адукацыі, накіраваць яго на развіццё прадукцыйнага мыслення вучняў, фармаванне сацыяльна ўхваленых цэнасных арыентацый, г.зн. усіх тых якасцей, якія вызначаюць аблічча нашага сучасніка.

Рэалізаваць дадзены сацыяльны заказ вельмі няпроста: кожны чалавек валодае індывідуальнымі асаблівасцямі, якія аказваюць істотны ўплыў на ўспрыманне, перапрацоўку ўздзеянняў, што ідуць звонку. У людзей розныя здольнасці, жаданні, жыццёвыя планы, якія таксама павінны ўлічвацца ў адукацыйным працэсе. Асабліва складана гэта вырашыць у сістэме сярэдняй адукацыі, масавы характар якой прывёў да таго, што класы сталі разнароднымі па сваім саставе.

Неабходнасць абавязковай сярэдняй адукацыі тлумачыцца агульнацывілізацыйным характарам навукова-тэхнічнага прагрэсу, ва ўмовах якога кожны чалавек павінен атрымаць максімум ведаў, уменняў і навыкаў, якія дазваляюць яму паўнацэнна існаваць у сучасным грамадстве. Апошняе, аднак, мае патрэбу ў людзях, здольных не толькі ўзнаўляць, але і ствараць новыя матэрыяльныя і духоўныя каштоўнасці. У гэтай сувязі школьнік павінен мець магчымасць раскрыць свае дараванні і рэалізаваць іх у выбранай сферы дзейнасці. Ступень задавальнення сутнаснай патрэбнасці чалавека ў самарэалізацыі ў многім вызначае яго ўласны дабрабыт і стабільнасць грамадства. Задача школьнай адукацыі ў тым, каб садзейнічаць гэтаму ў максімальнай меры. Адзін з сродкаў рэалізацыі ўказанай задачы — дыферэнцыяцыя сярэдняй адукацыі. Трэба адзначыць, што дзяржаўная палітыка ў гэтай галіне вызначаецца шэрагам фактараў, сярод якіх — адукацыйная традыцыя, існуючы ў грамадстве погляд на сацыяльную справядлівасць, фінансавыя магчымасці краіны.

На працягу савецкай гісторыі адносіны да дыферэнцыяцыі былі неадназначнымі. Найбольш плённымі аказаліся 60-ыя гг., калі з'явіліся факультатыўныя заняткі па выбары, пашырылася сетка класаў (школ) з паглыбленым вывучэннем прадметаў. Падобныя новаўвядзенні былі абумоўлены патрэбнасцю ў добра падрыхтаваных выпускніках школ, здольных лёгка адаптавацца да інстытуцкіх умоў навучання і ў далейшым паспяхова працаваць у навуцы, культуры, на вытворчасці, забяспечваючы дынамічнае развіццё краіны. Не адыходзячы ад асноватворных прынцыпаў, закладзеных у адукацыйную сістэму пры яе стварэнні, спрабавалі, рэалізуючы рэзервы, узмацніць яе развіццёвы патэнцыял. Акрамя таго, увага педагагічнай навукі і практыкі была накіравана на знаходжанне такіх прыёмаў і сродкаў навучання, якія забяспечвалі б засваенне ўсімі вучнямі праграмнага матэрыялу, што дазволіла б ліквідаваць непаспяховасць і другагодніцтва. Пазней, у 80-ыя гг., калі стала відавочнай нерэальнасць гэтай задачы, узнікла ідэя рознаўзроўневага навучання, ва ўмовах якога ўсе школьнікі павінны засвойваць толькі базавы кампанент зместу адукацыі, які складаецца з мінімуму звестак.

У цяперашняй сацыякультурнай сітуацыі, якая характарызуецца плюралізмам поглядаў, падыходаў, ацэнак

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

меркаванняў, на сучасным этапе развіцця педагагічнай думкі, што абвяшчае прыярытэт асобы над мэтамі і зместам адукацыі пры абавязковай накіраванасці апошніх на сапраўдныя ўзоры культуры, ствараюцца непараўнальна больш спрыяльныя ўмовы для ажыццяўлення дыферэнцыяцыі, чым у папярэднія гады. Гэтаму садзейнічаюць таксама некаторыя тэндэнцыі ў грамадскім, эканамічным развіцці краіны. Так, дзякуючы курсу на дэмакратызацыю ў кожнага грамадзяніна з'явілася магчымасць самаідэнтыфікацыі, што вядзе да адкрыцця адпаведных класаў і школ, дзе вучні далучаюцца да роднай культуры і ў той жа час атрымліваюць усе неабходныя веды для таго, каб нармальна адчуваць сябе ў краіне, грамадзянамі якой яны з'яўляюцца. Падобны падыход дазваляе захоўваць мір і стабільнасць у грамадстве, не абвастраць яго нацыянальныя праблемы.

З'яўленне сацыяльных слаёў, прадстаўнікі якіх у стане аплаціць адукацыю сваіх дзяцей, стымулюе развіццё прыватных навучальных устаноў. У іх, як правіла, невялікія па напаўняльнасці класы, што дазваляе не толькі дыферэнцаваць, але і індывідуалізаваць навучальны працэс. Пры наяўнасці кваліфікаваных педагагічных кадраў гэта, безумоўна, станоўча адаб'ецца на якасці падрыхтоўкі тых, хто займаецца ў такіх школах.

Акрамя прыватных, функцыянуюць і іншыя "элітарныя" навучальныя ўстановы. Гэта абумоўлена асэнсаваннем часткай грамадства таго факта, што высокі ўзровень адукацыі можа забяспечыць поспех у жыцці, прыстойную пазіцыю ў сацыяльнай іерархіі. Мае месца і іншая тэндэнцыя: погляд на адукацыю набывае ўсё больш прагматычны характар, што выражаецца, у прыватнасці, у вылучэнні адносна стабільнай групы "прэстыжных" прадметаў, па якіх многія вучні хацелі б атрымаць павышаны ўзровень падрыхтоўкі.

На фармаванні адукацыйных патрэбнасцей школьніка адбіваецца сацыякультурная абстаноўка, у якой ён знаходзіцца. Вялікае значэнне маюць адносіны да адукацыі бацькоў, равеснікаў, а таксама наяўнасць магчымасці далучацца да культурных каштоўнасцей. Безумоўна, у вучняў, што жывуць у вялікіх гарадах, такіх магчымасцей больш. Але ў апошні час прадпрымаюцца актыўныя спробы весці мэтанакіраваную адукацыйную палітыку і на сяле, для чаго канцэнтруюцца намаганні мясцовых устаноў, валодаючых адукацыйным патэнцыялам. У раённых цэнтрах ствараюцца ліцэі, гімназіі, нацэленыя на прадастаўленне вучням павышанага ўзроўню падрыхтоўкі. Усё гэта, безумоўна, дасць станоўчы эфект. Аднак уклад сельскага жыцця, аддаленасць ад культурных цэнтраў адбіваюцца на якасці адукацыі сельскіх вучняў, што вымушае дзяржаву да некаторага пратэкцыянізму ў адносінах да іх пры паступленні ў вышэйшыя навучальныя ўстановы.

Усёўзрастаючы ў апошнія гады паток інфармацыі не можа ўспрымацца і засвойвацца адным чалавекам на аднолькава высокім узроўні з-за аб'ектыўных і суб'ектыўных прычын. Гэта робіць зусім неабходнай дыферэнцыяцыю адукацыі, якая заключаецца ў адборы звестак, што падлягаюць засваенню ўсімі вучнямі, і прадастаўленні ім магчымасці атрымаць павышаную падрыхтоўку па прадметах, адпавядаючых іх здольнасцям і жыццёвым планам. Пры гэтым школьнікам павінен гарантавацца ўлік іх індывідуальных праяўленняў у адукацыйным працэсе (з натуральнымі абмежаван-

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

нямі, абумоўленымі яго масавым характарам).

Нагадаем, што сучасная культура мае складаную будову. Такая яе частка, як навуковае веданне, напрыклад, складаецца з наступных кампанентаў: філасофіі, матэматыкі, касмалогіі, хіміі, фізікі, кібернетыкі, біялогіі, антрапалогіі, грамадазнаўства, комплексу практычных навук [4]. Акрамя навуковай, існуе, як вядома, мастацкая форма пазнання. Відаў мастацтва не менш, чым навук, — прыкладное, цыркавое, дэкаратыўнае, прамысловае, а таксама архітэктура, жывапіс, графіка, скульптура, літаратура, тэатр, музыка, харэаграфія, фатаграфія, кіно, тэлебачанне і г.д. [1]. На кожнай наступнай ступені школьнай адукацыі колькасць галін сучаснай культуры, якія належыць засвоіць і якія прадстаўлены ў выглядзе вучэбных дысцыплін, няўхільна расце. Сапраўды, дашкольнае выхаванне і навучанне не маюць дакладнай прадметнай структуры; у пачатковай школе з-за ўзроставых абмежаванняў прадметная структура адукацыі прадстаўлена звужана; у сярэднім звяне колькасць вывучаемых дысцыплін павялічваецца, а на трэцяй ступені школы яна набывае максімальна выражаны характар. Многія з школьных дысцыплін з'яўляюцца інтэграванымі: у іх аб'ядноўваюцца звесткі з розных навук, якія маюць самастойнае значэнне.

Такім чынам, адной з падстаў дыферэнцыяцыі школьнай адукацыі з'яўляецца структура сучаснага ведання ў яго навуковай і мастацкай формах. Рэальныя магчымасці для такой дыферэнцыяцыі ўзнікаюць на трэцяй ступені. Менавіта да гэтага ўзросту большасць вучняў аказваюцца гатовымі да свайго прафесійнага самавызначэння. На першай і другой ступенях падобная дыферэнцыяцыя нерэальная з-за няспеласці псіхічных працэсаў у дзяцей, хаця некаторыя індывідуальныя праяўленні здольнасцей і мыслення могуць мець месца ўжо ў гэтым узросце.

Старшакласнік для сваёй спецыялізацыі выбірае тую сферу культуры, да якой адчувае найбольшую схільнасць. Яна праяўляецца ў працэсе далучэння да спосабаў дзейнасці, выпрацаваных чалавецтвам у ходзе гісторыка-культурнага развіцця. Набываючы здольнасць ацэньваць свае магчымасці, навакольную рэчаіснасць, намячаць мэты і шляхі яе пераўтварэння, школьнік з вялікай колькасці галін ведаў, прадстаўленых вучэбнымі дысцыплінамі, вылучае тыя, якія аказваюць найбольшае ўздзеянне на яго эмацыянальную і інтэлектуальную сферы. Менавіта тут ён у самай высокай ступені рэалізуе свае здольнасці, творчы патэнцыял, асобасныя якасці. Пры наяўнасці адпаведных умоў фармаванне прафесіянальнага мыслення школьніка і развіццё іх спецыяльных дараванняў у старэйшым падлеткавым узросце інтэнсіфікуюцца.

Верагоднасць таго, што пазнавальныя патрэбнасці школьніка будуць задаволены, павялічваецца пры пашырэнні колькасці профіляў на старэйшай ступені сучасных навучальных устаноў. Прафілізацыю сярэдняй школы можна разглядаць як спробу “падпарадкавання адукацыйных інстытутаў задачам рознабаковага і свабоднага развіцця чалавека”, істотны крок “у бок гібкасці, дыверсіфікаванасці, адкрытасці, варыятыўнасці, рухомасці сістэмы адукацыі, а галоўнае — у бок падпарадкавання яе мэтам і ўстаноўкам асобаснага і індывідуальнага развіцця” [6, *14*].

Аднак толькі прафілізацыі адукацыі, якая ажыццяўляецца ў адпавед-

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

насці з структурай навуковага ведання на трэцяй ступені, будзе недастаткова для таго, каб забяспечыць патрэбнае развіццё вучняў. Бо нават у профільных класах, дзе, здавалася б, навучаюцца тыя, каго аб'ядноўваюць імкненне да авалодання ведамі і добрая падрыхтоўка, кожны мае свае асаблівасці, якія праяўляюцца падчас заняткаў. Так, у матэматычных класах знойдуцца вучні, больш здольныя да алгебры, і тыя, хто аддае перавагу геаметрыі; адзін вучань, які наведвае філалагічны клас, з задавальненнем займаецца мовамі, а другі — літаратурнай творчасцю. Таму і ў класах з аднародным па ўзроўні падрыхтоўкі саставам неабходна дыферэнцыяцыя навучання, каб улічваць асаблівасці мыслення, здольнасці вучняў, іншыя ўласцівасці, якія адбіваюцца на ходзе вучэбнай працы.

Такім чынам, другой падставай дыферэнцыяцыі сучаснай школьнай адукацыі з'яўляюцца індывідуальныя асаблівасці вучняў, якія ўплываюць на выніковасць навучання. Іх улік неабходны на ўсіх ступенях, але асаблівую ўвагу трэба ім надаваць у пачатковых і сярэдніх класах, паколькі менавіта там закладваецца падмурак далейшага паспяховага руху школьніка па шляху авалодання ведамі. Вырашэнне гэтай праблемы сутыкаецца з значнымі цяжкасцямі, перш за ўсё арганізацыйнага характару. Сапраўды, калі старшакласнікі могуць задаволіць свае пазнавальныя інтарэсы самастойна, то вучні першай і другой ступеней незалежна ад ўзроўню падрыхтоўкі маюць патрэбу ў кваліфікаванай дапамозе старэйшых. Аднак удзяліць увагу кожнаму вучню ва ўмовах высокай напаўняльнасці класаў наўрад ці рэальна. Значыць, сам характар навучання ў яго цяперашнім выглядзе накладвае пэўныя абмежаванні, якія адбіваюцца на ажыццяўленні дыферэнцыяцыі, да якіх бы сродкаў іх змякчэння настаўнік ні звяртаўся.

Існуюць розныя формы дыферэнцаванага навучання, у прыватнасці класы выроўнівання, стымулюючыя (падтрымліваючыя) заняткі, факультатывы і інш. Зразумела, аднак, што сапраўдны ўлік асобасных якасцей навучэнцаў і стварэнне рэжыму работы, аптымальнага для кожнага з іх, магчымы толькі пры індывідуальным навучанні. Зрэшты, такі від навучання не можа дамінаваць у сучаснай агульнай адукацыі, асноўнай характарыстыкай якой з'яўляецца масавасць.

1. *Борев Ю.Б.* Эстетика. — 2-е изд. — М.: Политиздат, 1975. — 399 с.
2. *Каган М.С.* Человеческая деятельность: Опыт системного анализа. — М.: Политиздат, 1974. — 328 с.
3. *Корнетов Г.Б.* Развитие историко-педагогического процесса в контексте цивилизационного подхода: Дис. ... д-ра пед. наук. — М., 1994.
4. *Леднев В.С.* Содержание образования: сущность, структура, перспективы. — 2-е изд., перераб. — М.:Высш. шк., 1991. — 224 с.
5. *Шадриков В.Д.* Философия образования и образовательные политики. — М.: Логос, 1993. — 181 с.
6. *Щедровицкий П.Г.* Очерки концепции непрерывного образования // Очерки по философии образования. — М., 1993.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ